Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# СІМВАЛЫ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ
(віктарына)

Молчан Таццяна Аляксандраўна,
выхавальнік дашкольнай установы
без кваліфікацыйнай катэгорыі

аг. Грыцкевічы, 2022

Праграмныя задачы: развіваць патрэбнасць у пазнанні сацыяльнай рэчаіснасці; удакладняць і пашыраць уяўленні пра дзяржаву (Прэзідэнт, яго прозвішча, імя, імя па бацьку) і дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь (сцяг, герб, гімн).

Ход занятку:

- Дзеці як вы разумееце словы «Радзіма»? (Родны край; месца, дзе мы нарадзіліся; краіна, дзе мы жывём)

- Наша радзіма – Рэспубліка Беларусь. Мы – грамадзяне Рэспублікі Беларусь. У нашай краіне жывуць людзі розных нацыянальнасцей: беларусы, рускія, украінцы, палякі, татары, яўрэі. Мы ганарымся нашай краінай, яе людзьмі і дасягненнямі.

- А зараз мы з вамі пагуляем у віктарыну "Сімвалы нашай дзяржавы"

- Дзеці давайце падзелімся на дзве каманды, я кожнай камандзе па чарзе буду задаваць пытанні. За кожны правільны адказ камандзе налічваецца адзін бал. Каманда, якая набярэ большую колькасць балаў, з'яўляецца пераможцай.

- Зараз паслухайце ўважліва верш Н. Гальпяровіча "Сімвалы маёй краіны"

Калі на наш гляджу я сцяг,
То бачу ўвесь свой родны край:
Палёў квітнеючых абсяг,
І веліч дрэў, і птушак грай.
За гэты наш утульны дом
Мы ўдзячны продкам і бацькам.
Мы на сваёй зямлі жывём,
А іншае не трэба нам.
Мы маем сцяг, і гімн, і герб,
Мы імі ганарымся тут.
Яны здабыты ў барацьбе
За незалежны родны кут.
Краіны сімвалы сваёй
Я беражна з сабой бяру.
І хай лунае над зямлей
Імя святое - беларусь!

(Выхавальнік вывешвае дзецям дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь).

1. Каманда

- Якія дзяржаўныя сімвалы ёсць у кожнай краіны? (дзяржаўны сцяг, дзяржаўны герб, дзяржаўны гімн.)

2. Каманда

- Якімі раслінамі пераплецены каласы на дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь? (з аднаго боку - ружовымі кветкамі канюшыны, з другога - блакітнымі кветкамі ільну.)

1. Каманда

- Дзе можна ўбачыць выяву дзяржаўнага герба? (на пячатках, пашпартах, грашовых знаках, дакументах.)

2. Каманда

- Колькі колераў мае дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь? (тры колеры: чырвоны, зялёны, белы.)

1. Каманда

- Што такое дзяржаўны гімн? (урачыстая песня, якая сімвалізуе дзяржаўнае адзінства.)

2. Каманда

- Што абазначае на дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь зялёны колер? (колер прыроды, сімвал дабра, росту, дабрабыту і міру.)

- Малайцы! Вы ўсе справіліся з усімі заданнямі. Ва ўзнагароду кожны з вас атрымлівае маленькія медалі ў знак таго, што вы сапраўдныя грамадзяне Рэспублікі Беларусь.






MY MOM IS MY SUPERHERO